# Весці БДПУ

**Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.**
**Выдаецца з чэрвеня 1994 г.**

**№ 3(49) 2006**

**СЕРЫЯ 2.**
**Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія.**
**Эканоміка. Культуралогія**



*Галоўны рэдактар:*
П. Дз. Кухарчык

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. В. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Гіруцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч



ВЕСЦІ БДПУ №3
(сер 3), 2006

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ


## Змест

### Гісторыя


*Бушчык Г. П.* Мінск у міжрэспубліканскіх эканамічных сувязях (1950—1990 гг.) .......... 3

*Янкоўская Т. У.* Перадумовы распрацоўкі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Беларусі .......... 11

*Вялікі А. Ф.* Савецка-германскі пратакол аб перасяленні насельніцтва ад 28 верасня 1939 г. і яго выкананне ў Беларусі ў 1939—1940 гг. .......... 15

*Крывіцкі Д. С.* Германскія спецслужбы на акупіраванай тэрыторыі Беларусі (май 1941 — сакавік 1942 г.) .......... 18

*Пуцік У. С.* Аграрна-сялянскія праблемы ў праграмах і дзейнасці партый і грамадскіх рухаў правага кірунку ў Беларусі падчас Першай расійскай рэвалюцыі .......... 22

*Біндараў А. В.* Роля царкоўнапрыходскіх школ у правядзенні нацыянальна-рэлігійнай палітыкі ў Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст. .......... 26

*Цымбал А. Г.* Усталяванне аўтакефаліі Праваслаўнай Царквы ў Польшчы ў першай палове 20-х гг. XX ст. .......... 30

*Крывіцкая К. В.* Прафранцузскія настроі насельніцтва Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай воласці напярэдадні вайны 1812 г. .......... 34

*Груца І. А.* Версіі лёсу маскоўскіх трафеяў Напалеона, звязаныя з азёрамі Семлеўскае і Стаячае, іх крытыка .......... 37

*Калечыц І. Л.* Эпіграфічныя помнікі X — першай паловы XIV ст. як адлюстраванне сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных працэсаў на тэрыторыі Беларусі .......... 41

*Цзян-Шу-і.* Расійска-тайваньскія адносіны ў пачатку 90-х гг. XX ст. ...станаўленне «тайванязнаўства» ў Расіі .......... 43


### Філасофія


*Кавалевіч М. С.* Станаўленне сінергетычнага падыходу ...а даследавання працэсаў прафесійнага самавызначэння .......... 47

*Юрашэвіч І. П.* Усходнеславянскі цывілізацыйны тып у сістэме ...ыялогу культур Усходу і Захаду .......... 50

*Васько І. І.* Асэнсаванне прыроды і прызначэння дзяржаўнай улады ...учаснай сацыяльнай думцы Рускай Праваслаўнай Царквы .......... 54


### Паліталогія


...чанка В. А., Паўлава Н. В., Сцяпанаў Г. І. Станаўленне ...ртыйнасці як умова фарміравання грамадзянскага ...ства ў Рэспубліцы Беларусь .......... 61

...умаў Дз. І., Саланінка А. Дз. Рэфармацыя и генезіс палітычнай ...ы беларускага соцыуму .......... 63

УДК 947.084.7

А. Ф. Вялікі

# САВЕЦКА-ГЕРМАНСКІ ПРАТАКОЛ АБ ПЕРАСЯЛЕННІ НАСЕЛЬНІЦТВА АД 28 ВЕРАСНЯ 1939 г. І ЯГО ВЫКАНАННЕ Ў БЕЛАРУСІ Ў 1939—1940 гг.

Ідэя масавых перасяленняў насельніцтва як рашэнне этнічных праблем у стасунках паміж дзяржавамі мае даўнюю гісторыю. Да XX ст. практыкаваліся масавыя перамяшчэнні насельніцтва, якія трактаваліся па-рознаму: рэпатрыяцыя, абмен насельніцтвам, перасяленне, перамяшчэнне і г. д. Аднак толькі XX ст. выкрысталізавала гэту ідэю, тэарэтычна абгрунтавала і практычна ажыццявіла. Ідэя перасяленняў была прапанавана ў 1916 г. швейцарцам французскага паходжання Ж. Мантадонам. На яго думку, гэта быў прамы шлях да рэалізацыі канцэпцыі этнічна аднароднай нацыянальнай дзяржавы.

На Версальскай мірнай канферэнцыі пры ўсталяванні новых межаў адразу ж узнікла праблема нацыянальных меншасцей, якія заявілі аб сабе ў новых дзяржавах — Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі і г. д. Для вырашэння гэтай праблемы былі прапанаваны два варыянты: а) перасяленні і б) гарантыі свабоднага развіцця нацыянальных меншасцей. Аднак пасля Першай сусветнай вайны толькі на Балканах пачаліся перасяленні нацыянальных меншасцей. Прыкладам сталі падпісаная ў 1919 г. у Нейі грэчаска-балгарская, а таксама грэчаска-турэцкая канвенцыя, падпісаная ў 1923 г. у Лазане [5]. Разам з тым, як падкрэсліла расійская даследчыца Л. Мілякова, ні адзін з колішніх вядучых палітыкаў не прапанаваў практыку перасялення нацыянальных меншасцей у іншых раёнах Еўропы, акрамя Балканскага. А сам балканскі вопыт разглядаўся ў той час негатыўна, улічваючы перш за ўсё вялікія эканамічныя і сацыяльныя выдаткі, якія выклікала гэтая аперацыя.

Ідэю перасялення выкарыстаў А. Гітлер, калі праз спланаваную акцыю «Zuruck nach Reich» каля аднаго мільёна немцаў у 1939—1940 гг. было пераселена ў Германію з Італіі, Латвіі, Эстоніі, Валыні, Усходняй Галіцыі, Венгрыі і іншых рэгіёнаў Еўропы [8, s. 27].

Пачатак Другой сусветнай вайны «ўцягнуў» Савецкі Саюз і Беларусь у перасяленчыя акцыі. У выніку падзелаў сфер уплыву паміж СССР і Германіяй, а таксама ўсталявання новай мяжы паміж гэтымі дзяржавамі паўстала пытанне аб немцах, рускіх, украінцах, беларусах, паляках, якія жылі па абодва бакі мяжы. Таму ўжо ў верасні 1939 г. перад Савецкім Саюзам і Германіяй паўстала пытанне вызначэння пазіцыі ў адносінах да гэтых людзей. Сакрэтны «Даверыцельны пратакол адносна магчымасці перасялення насельніцтва, якое пражывае ў сферах інтарэсаў урадаў СССР і Германіі», ад 28 верасня 1939 г. вызначыў гэтыя падыходы. Урады Савецкага Саюза і Германіі пагадзіліся, што «Урад СССР не будзе перашкаджаць нямецкім грамадзянам і другім асобам нямецкага паходжання, якія пражываюць у сферах яго інтарэсаў, калі яны будуць мець жаданне перасяліцца ў Германію ці ў сферу германскіх інтарэсаў. Ён згодны, што гэта перасяленне будзе ажыццяўляцца ўпаўнаважанымі Германскага ўрада ў згодзе з кампетэнтнымі мясцовымі ўладамі і што пры гэтым не будуць закранутыя маёмасныя правы перасяленцаў. Адпаведнае абавязацельства прымае на сябе Германскі ўрад адносна асоб украінскага ці беларускага паходжання, якія пражываюць у сферы яго інтарэсаў» [7, с. 89—90].

Актыўную ролю ў перасяленчым працэсе адыграла Перасяленчае ўпраўленне (ПУ) пры СНК СССР, якое да сярэдзіны кастрычніка 1939 г. падрыхтавала і ўнесла на разгляд і зацвярджэнне ў СНК СССР прапановы аб штатах, колькасці, месцы знаходжання апарату ўпаўнаважаных па перасяленні, інструкцыю, якая вызначала іх службовыя абавязкі і правы, рэгламентавала іншыя пытанні [3, л. 20—31, 46]. У час іх падрыхтоўкі начальнік ПУ А. Чакмянёў праводзіў інтэнсіўныя кансультацыі з урадам Беларусі і нават правёў спецыяльную нараду па гэтым пытанні ў Беластоку з прадстаўнікамі Часовых упраўленняў гарадоў і раёнаў заходніх абласцей Беларусі. Ён паведамляў 4 лістапада 1939 г. намесніку наркома замежных спраў СССР А. Вышынскаму наступнае: «Прапаноўваемы мной праект інструкцыі (аб працы ўпаўнаважаных. — *А. В.*) узгоднены з СНК БССР, а таксама з сакратаром ЦК КП(б)Б т. Кулагіным. Акрамя гэтага, праект інструкцыі быў прапрацаваны на нарадзе старшынь Часовых упраўленняў у г. Беластоку. Усе заўвагі ўлічаны»[3, л. 32]. Падрыхтаваныя ПУ дакументы былі разгледжаны і 21 кастрычніка 1939 г. зацверджаны пастановай СНК СССР № 1729 —433 с. [3, л. 9].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У развіцці гэтай пастановы і ў мэтах яе практычнага ажыццяўлення 16 лістапада 1939 г. было падпісана савецка-нямецкае пагадненне аб узаемным перасяленні з СССР асоб нямецкай нацыянальнасці, а з вобласці дзяржаўных інтарэсаў Германіі (акупіраванай тэрыторыі Польшчы) — асоб украінскай, беларускай і рускай нацыянальнасцей [1, с. 132]. У артыкуле 1-м адзначалася: «Абодва Дагаварныя Бакі абавязуюцца па падпісанні сапраўднага Пагаднення <…> прыступіць да эвакуацыі ўсіх грамадзян украінскай, беларускай і рускай нацыянальнасцей, якія пражываюць на тэрыторыях былой Польшчы і ў цяперашні час знаходзяцца ў граніцах дзяржаўных інтарэсаў Германіі, а таксама грамадзян нямецкай нацыянальнасці, якія пражываюць на тэрыторыях былой Польшчы і ў цяперашні час знаходзяцца ў граніцах дзяржаўных інтарэсаў Савецкага Саюза»[4, с. 56]. У пагадненні адзначалася, колькі і якіх рэчаў мае права ўзяць з сабой перасяленец, інструментаў для выканання сваіх прафесійных абавязкаў, колькасць грошай, каштоўных металаў, прадметаў даўніны і г. д. Для правядзення перасялення была створана Змешаная савецка-германская камісія і прызначаны ўпаўнаважаныя, якія павінны былі апублікаваць у газетах узгодненае паведамленне аб яго ўмовах. У 10-дзённы тэрмін жадаючыя перасяляцца падавалі ў камісіі заявы, якія разглядаліся ўпаўнаважанымі, і ў выніку станоўчага рашэння павінны былі зацвярджаць галоўныя ўпаўнаважаныя. Яны ж вызначалі маршруты руху перасяленцаў, кантрольна-прапускныя пункты (КПП), праз якія ажыццяўлялася перасяленне і г. д. [4, с. 56]. У Заходняй Беларусі савецкія ўпаўнаважаныя размяшчаліся ў Гродне, Баранавічах, Навагрудку, Беластоку, Брэсце [3, л. 37].

Да месца свайго прызначэння савецкія ўпаўнаважаныя прыбылі 20—22 лістапада, але да канца снежня не пачыналі працу, з-за «адсутнасці даных аб колькасці чалавек, якія належаць эвакуацыі і ўладкаванню» [3, л. 38]. На самай справе Перасяленчае ўпраўленне першапачаткова не ўяўляла, колькі чалавек можа перасяліцца ў СССР з тэрыторыі, якая ўвайшла ў «сферу інтарэсаў Германіі». Так, А. Чакмянёў у пачатку лістапада 1939 г. паведамляў А. Вышынскаму, што «па папярэдніх даных савецкіх прадстаўнікоў колькасць насельніцтва, якое падлягае эвакуацыі (на тэрыторыю СССР. — *А. В.*), вызначаецца ў мільён чалавек. Даных аб складзе насельніцтва па родзе заняткаў камісія не мае, што <…> ускладняе пытанне аб падрыхтоўцы месц для яго рассялення і працаўладкавання» [3, л. 38]. Адкуль А. Чакмянёў узяў лічбу ў «адзін мільён чалавек» стала вядома з другой яго запіскі, накіраванай А. Вышынскаму ў канцы кастрычніка 1939 г. Начальнік ПУ адзначаў: «Савецкая дэлегацыя ў Камісіі (савецка-нямецкай. — *А. В.*) дае розныя лічбы: ад 524 тысяч да 2-х мільёнаў. Перасяленчым упраўленнем груба арыенціровачна быў узяты мільён чалавек і на гэтую колькасць праведзены разлік» [3, л. 9]. Расійская даследчыца Т. Іларыёнава таксама адзначае, што Савецкі Саюз меў намер прыняць каля мільёна чалавек. Германскі бок ацэньваў колькасць немцаў на тэрыторыях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны на парадак менш — каля 100 тыс. чалавек [5, с. 57]. Адзначым, што немцы практычна не памыліліся ў сваіх разліках.

Дакладныя даныя аб колькасці ўкраінцаў, беларусаў, рускіх, якіх намерваўся прыняць Савецкі Саюз, вызначыліся толькі 24 студзеня 1940 г. У гэты дзень у наркома замежных спраў СССР В. Молатава адбылася нарада з яго намеснікамі, на якой разглядалася адно пытанне: «Аб ходзе работы па эвакуацыі нямецкіх каланістаў і рабоце нашых упаўнаважаных на германскай тэрыторыі» [3, л. 64]. На нарадзе абмяркоўвалася запіска «Аб ходзе работы па эвакуацыі нямецкіх каланістаў і рабоце нашых упаўнаважаных на германскай тэрыторыі», якую 16 студзеня 1940 г. накіравалі В. Молатаву члены змешанай савецка-германскай камісіі А. Злобін, В. Масленікаў, І. Аркадзьеў. Яны падкрэслівалі: «У паведамленнях нашых галоўных упаўнаважаных на нямецкім баку нямецкія прадстаўнікі выказваюць здзіўленне і нават трывогу з-за пасіўнасці нашых упаўнаважаных у справе практычнай эвакуацыі. Прычым нашыя матывіроўкі і тлумачэнні ім падаюцца непераканаўчымі. Па цяперашні час нашыя ўпаўнаважаныя на германскім баку толькі праводзяць рэгістрацыю жадаючых эвакуіравацца са складу ўкраінскага, беларускага, рускага насельніцтва. Практычна мы не вывезлі з таго боку пакуль яшчэ ні аднаго чалавека. Калі б мы далі дырэктыву актывізаваць работу па рэгістрацыі і прыёме заяў на эвакуацыю, то гэтыя лічбы маглі б вельмі хутка павялічыцца ў некалькі разоў. Урадавая дэлегацыя мяркуе, што ў мэтах зняцця ў немцаў уражання пасіўнасці і нежадання ажыццяўляць эвакуацыю з германскага боку магчыма было б эвакуіраваць на нашу тэрыторыю ў агульнай колькасці да 20 000 чалавек» [3, л. 58—59].

В. Молатаў пагадзіўся з гэтай прапановай. На запісцы захавалася яго рэзалюцыя: «Саўнарком згодны з Вашымі прапановамі аб эвакуацыі ў СССР украінцаў, беларусаў, рускіх максімум да

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

20 тысяч. В. Молатаў. 25.01.40 г.» [3, л. 63]. Як вынікае з вышэйцытаванага, ні аб якім мільёне эвакуіруемых, якіх, паводле папярэдніх разлікаў Перасяленчага ўпраўлення планавалася прыняць у СССР, гаворка ўжо не ішла. Савецкі Саюз, каб «зняць дрэннае ўражанне немцаў», пагадзіўся прыняць усяго каля 20 тыс. чалавек.

У Беларусі перасяленне немцаў ажыццяўлялася пераважна з Беластоцкай і Брэсцкай абласцей. Нямецкія прадстаўнікі, у колькасці 30-ці чалавек, прыбылі ў Беластоцкую вобласць 4 снежня 1939 г. У выніку перамоў, што адбыліся паміж нямецкім і савецкім раённымі ўпаўнаважанымі, была дасягнута дамоўленасць, што нямецкі раённы ўпаўнаважаны будзе знаходзіцца ў Бельску, а тэрытарыяльныя ўчасткі ў м. Супрасль Беластоцкага павета, вёсцы Ізорка Ломжынскага павета, м. Ізабеліна Ваўкавыскага павета і м. Гайнаўка Бельскага павета [6, л. 108]. Адзначым, што з тэрыторыі, якая адышла да СССР, у Германію перасяляліся галоўным чынам немцы. Астатніх немцы лічылі непажаданым «элементам» і не «пускалі» ў Германію. Так, за перыяд працы змешанай савецка-германскай камісіі праз Брэст у Германію выехала (даныя па стане на 5 студзеня 1940 г.): немцаў — 5335 чалавек, палякаў — 108, украінцаў — 10, рускіх — 8, чэхаў — 1[6, л. 113]. Як вынікае з гэтага, ніводны беларус не выехаў у Германію. У той жа час савецкі раённы прадстаўнік адзначаў, што многія палякі выказвалі жаданне перасяліцца ў Германію. Ён адзначаў, што «асобныя жыхары Бельска, палякі, з'яўляюцца ў камісію і патрабуюць, каб іх вывезлі ў Германію. Да таго ж выказваюць рэзкую незадаволенасць савецкай уладай. Так, жыхар Бельска Ян Касцюк, па нацыянальнасці паляк, 12 снежня з'явіўся ў камісію і заявіў у прысутнасці нашых прадстаўнікоў аб сваім жаданні выехаць з СССР. Пры гэтым ён заявіў: «У час вайны маё сэрца было за немцаў. Калі вы мяне не выпусціце, то я нелегальна перабяруся ў Германію, я не цярплю бальшавікоў» [6, л. 114]. Т. Іларыёнава таксама адзначае, што тэрыторыю, якая ўвайшла ў склад СССР, жадалі пакінуць ні толькі этнічныя немцы, але і палякі [4, с. 58].

У сярэдзіне студзеня 1940 г. рэгістрацыя і перасяленне нямецкіх грамадзян, якія пажадалі выехаць з СССР у Германію, у асноўным была скончана [2, л. 5]. Ва ўжо ўзгаданай запісцы А. Злобіна, В. Масленікава і І. Аркадзьева падкрэслівалася: «Па стане на 14 студзеня 1940 г. на выезд у Германію запісалася 28 121 сям'я нямецкіх каланістаў, агульнай колькасцю 110 656 чалавек. Адпраўлена на германскую тэрыторыю з ліку запісаўшыхся 79 710 чалавек. Запіс жадаючых эвакуіравацца немцаў у асноўным скончаны» [3, л. 63]. Падкрэслім, што агульная колькасць у 110 656 чалавек, якія пажадалі выехаць у Германію, прыпадае на Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну, бо і на яе тэрыторыі ажыццяўлялася аналагічная перасяленчая акцыя.

Паводле даных беларускага гісторыка У. Снапкоўскага, з акупіраванай Германіяй тэрыторыі Польшчы ў Беларусь, на аснове савецка-нямецкага пагаднення аб перасяленні, выехала каля 15 тысяч беларусаў. З Заходняй Беларусі ў Германію выехала каля 25 тысяч немцаў [1, с. 132—133].

Аналізуючы перасяленчую акцыю, якая ажыццяўлялася на аснове савецка-нямецкага пагаднення ад 16 лістапада 1939 г., адзначым наступнае. Нягледзячы на тое, што ў пагадненні дэкларавалася, што «эвакуацыя з'яўляецца добраахвотнай», умовы яе правядзення былі далёкімі ад «добраахвотнасці. Фактычна людзям не пакінулі ні выбару, ні часу. Нагадаем, што ў запісцы, накіраванай В. Молатаву 16 студзеня 1940 г., падкрэслівалася, што на гэты момант «не вывезена практычна ні аднаго чалавека». Аднак вышэй узгадвалася, што ў сярэдзіне студзеня рэгістрацыя на перасяленне была скончана і ў асноўным тыя, хто жадаў перасяліцца, гэта зрабілі з абодвух бакоў. Як вынікае з гэтага, нават калі ўлічыць, што нямецкія ўпаўнаважаныя прыбылі на Беласточчыну 4 снежня, а савецкія — 20—22 снежня 1939 г., то перасяленчая акцыя доўжылася менш месяца. Тады аб добраахвотнасці гаварыць не прыходзіцца. Для нямецкіх каланістаў, якія пражывалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі (у Столінскім раёне, Бельску, Беластоку, Ізорцы ды іншых гарадах і мястэчках), не было шанцаў застацца ў Беларусі, бо органы НКУС разглядалі ўсіх немцаў як патэнцыяльных ворагаў, своеасаблівую «пятую калону» ў прыгранічнай тэрыторыі. Так, Нарком НКУС Л. Цанава паведамляў першаму сакратару ЦК КП(б)Б П. Панамарэнку наступнае (студзень 1940 г.): «Па даных НКУС БССР, у гэтым раёне (Столінскім раёне Пінскай вобласці. — *А. В.*) знаходзіцца нямецкая калонія «Сафійка». Агентурнай распрацоўкай каланістаў «Сафійкі» ўстаноўлена, што значная іх частка настроена варожа ў адносінах да савецкай улады. Гітлераўцы калоніі «Сафійка» сістэматычна збіраюцца дома ў Марціна Рыля, слухаюць радыёперадачы і праводзяць работу сярод немцаў за выезд у Германію. Агентурная справа «Сафійка» актывізуецца з мэтай яе ліквідацыі ў бліжэйшы час» [6, л. 192—193].

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

Дэкларатыўнымі з'яўляліся ўмовы пагаднення, якія закраналі маёмасны бок. Члены савецка-германскай змешанай камісіі адзначалі, што перасяленцы і з таго і з другога боку ліхаманкава распрадаюць маёмасць, бо разумелі, што ўсё немагчыма будзе ўзяць. Улічваючы гэтыя факты, камісія прапанавала аблвыканкомам (Брэсцкаму і Беластоцкаму), каб апошнія прынялі пастанову, якая забараняе продаж і куплю жывёлы, а таксама забарону ўсіх маёмасных здзелак з моманту падпісання пагаднення (г. зн. з 16 лістапада 1939 г.) [3, л. 60—61]. Таму акцыю, што адбывалася ў 1939—1940 гг. на тэрыторыі Беларусі, улічваючы формы, метады, сціслаисць часу, магчыма характарызаваць як эвакуацыю, а не перасяленне.

На жаль, дакументальныя матэрыялы Нацыянальнага архіва РБ, Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі пакуль што не могуць даць поўнага ўяўлення аб эвакуацыі насельніцтва, што ажыццяўляўся з Беластоцкай і Брэсцкай абласцей БССР. Да цяперашняга часу дакладна не вядомы колькасны, нацыянальны, прафесійны, узроставы, сацыяльны стан тых, хто змог пераехаць у Германію, а таксама тых, хто пераехаў у БССР, колькасны склад савецкіх улаўнаважаных і іх узаемаадносіны з нямецкімі ўпаўнаважанымі і г. д. Больш істотным, на наш погляд, з'яўляецца наступнае. У пачатку Другой сусветнай вайны Беларусь была ўцягнута ў перасяленчыя працэсы, якія набылі надзвычай вялікія памеры пасля яе заканчэння. Беларусь не мела ніякага дачынення да савецка-германскага пагаднення аб «эвакуацыі» і не нясе адказнасці за яе ажыццяўленне дзвюма таталітарнымі дзяржавамі — Германіяй і Савецкім Саюзам. Крытычная пераацэнка савецка-германскіх дамоўленасцей 1939—1941 гг. адбылася на Другім з'ездзе народных дэпутатаў СССР, які 24 снежня 1939 г. прыняў пастанову «Аб палітычнай і прававой ацэнцы савецка-германскага дагавора аб ненападзе ад 1939 года», у якой пацвердзіў, што гэты дагавор, а таксама Дагавор аб дружбе і граніцы паміж СССР і Германіяй ад 28 верасня 1939 г. і іншыя савецка-германскія дамоўленасці ў адпаведнасці з нормамі міжнароднага права страцілі сілу ў момант нападу Германіі на СССР. Быў асуджаны сам факт падпісання сакрэтнага дадатковага пратакола ад 23 жніўня 1939 г. і іншых сакрэтных дакументаў, а гэта значыць і «Даверыцельнага пратакола адносна магчымасці перасялення насельніцтва, якое пражывае ў сферах інтарэсаў урадаў СССР і Германіі», ад 28 верасня 1939 г., пагаднення ад 16 лістапада аб перасяленні насельніцтва паміж СССР і Германіяй. Сакрэтныя пратаколы прызнаны юрыдычна неправамернымі і несапраўднымі з моманту іх падпісання [1, с. 134]. Разам з тым гэтая старонка гісторыі Беларусі патрабуе далейшага грунтоўнага і аб'ектыўнага вывучэння і аналізу.

Літаратура і крыніцы

1. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі : вучэб. дапам. для студ. фак. міжнар. адносін : У 2 ч. Ч. 2. Ад канца XVIII да пачатку XXI ст. / У. Е. Снапкоўскі. Мінск : БДУ, 2004.
2. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ), ф. Р-5456, воп. 24а, спр. 216.
3. ДАРФ), ф. Р-5456, воп. 24а, спр. 2562.
4. *Илларионова Т.* Обмен населением между СССР и Германией накануне и в начале Второй мировой войны // Отечественная история. 2004. № 4.
5. *Милякова Л. Б.* Польша на пути к моноэтничному государству (1918—1947 гг). http//: www.history.machaon.ru/all/number_13/analit4/milyakowa/index.html
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф. 4, воп. 21, спр. 2075.
7. Советско-германские документы 1939—1941 гг.: Из архива ЦК КПСС // Новая и новейшая история. 1993. № 1.
8. *Czerniakiewicz J.* Repatriacja ludnosci polskiej z ZSRR 1944—1948. Warszawa. Wyd-wo Nauk. PWN, 1987.

Summary

*The article reflects the realisation of the Soviet-Germany secret Treaty of the transfer of the population between the Soviet Union and the fascist Germany, which took place in 1939–1940 of the XX[th] century from the territory of Western region of Belarus. It's written on the basic of the archival records from the State archive of the Russian Federation and National archive of the Republic of Belarus.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

*УДК 947.084.8*

***Д. С. Крывіцкі***

# ГЕРМАНСКІЯ СПЕЦСЛУЖБЫ НА АКУПІРАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (МАЙ 1941 — САКАВІК 1942 г.)

**Уводзіны.** Супрацьстаянне савецкіх і нямецкіх спецслужбаў у Вялікай Айчыннай вайне выклікала і выклікае цікавасць як з боку даследчыкаў, так і пісьменнікаў, кі-